*Г. І. Нікалаенка, І. У. Таяноўская*

# ВІДЫ МАТЫВАЦЫЙНА АРЫЕНТАВАНЫХ ДАДАТКОВЫХ ЗАДАННЯЎ НА МАТЭРЫЯЛЕ ЗАЙМАЛЬНАГА ДЫДАКТЫЧНАГА АПАВЯДАННЯ (на прыкладзе казкі-забаўлянкі У. С. Ліпскага "Вясёлая азбука")

"Вясёлая азбука" аднаго з найбольш прызнаных майстроў нашай дзіцячай літаратуры Уладзіміра Сцяпанавіча Ліпскага – вядомы казачны цыкл з уводнай гісторыі-прыказкі і 18 забаўляльных казак аб прыгодах літар. Невыпадкова, што ў тым ліку за гэту кнігу аўтару ў свой час была прысуджана Літаратурная прэмія імя Янкі Маўра, якая адзначае лепшыя творы ў галіне дзіцячай літаратуры. Запамінальнасць (мнеманічны эфект) пабудовы адпаведнага казачнага свету грунтуецца не толькі на ізаляваным, але і на камбінаваным "партрэтаванні" літар, ідэі адначасовага замацавання фрагментаў-ланцужкоў з алфавітнай паслядоўнасці.

У дадзеным артыкуле прадстаўлена метадычна накіраванае апісанне і каментаванне відаў магчымых дадатковых заданняў на аснове казачных тэкстаў У. С. Ліпскага, што дазволіць яшчэ больш поўна раскрыць іх выразны навучальны і развіццёвы патэнцыял ва ўзаемасувязі з выкладаннем мовы і літаратуры на I-й ступені агульнай сярэдняй адукацыі – у пачатковай школе – альбо нават (выбіральна) на пачатку сярэдняга звяна навучання. Да такіх практычна апрабаваных заданняў належаць, у прыватнасці, наступныя.

- **Семантызацыя не зусім знаёмых слоў**, вызначэнне ўнутранай формы (этымона) на аснове пабудовы матывацыйных гіпотэз, падбор дарэчных перакладаў-адпаведнікаў: *вуркоцік* ← *вуркатаць* ('котик'); *шэрачок* ← *шэры* ('зайчик'); *назола* ← *назаляць* ('надоеда, приставала'); *цесляры* ← *цясаць* (дакладней 'плотник', а не 'столяр') і да таго падобных.
- **Расшыфроўка характэрнай лексікі, звязанай з казачным сюжэтам**, у тым ліку ў займальна арганізаванай форме (адгадванне загадкі, запаўненне крыжаслова і г. д.) Напрыклад, загадка з казкі "Дзе жыве *В*?" у складзе крыжаслова "Восем *В*":

  “Хоць не птушка – лётаць можа: памагае хвост прыгожы” (*Вавёрка*) [1, с. 321].
- **Стварэнне ўласнага тлумачэння слова на ўзор слоўнікавага артыкула**. Заданне можа выконвацца ў дачыненні да тых лексічных адзінак, якія падлягаюць семантызацыі, альбо іншых адметных слоў – напрыклад, індывідуальна-аўтарскага аказіяналізма *некалка*:

  “Насунулася аднойчы навальніца.

  На небе – ноч. Нічога наўкол нябачна. Нейкі насаты нячысцік… насміхаецца:

  – Нязнайка-нулевічок, назбіраў некалак незнарок!..

– Ратуйце мяне!.. – нечакана закрычаў Нулёк.

Нюра, Нюся, Насця, Навум адказваюць нязнайку ягонымі ж надакучлівымі некалкамі:

– Не можам!.. Не хочам!.. Не будзем!.. Не ўмеем!.. Не жадаем!.. Не і не!..” [1, с. 325–326].

Навучэнцы пры гэтым выконваюць ролю стваральнікаў тлумачальнага слоўніка – інакш кажучы, "юных лексікографаў".

- **Адшукванне маўленчых адрэзкаў у адпаведнасці з зададзенымі ўмовамі**. Прыклады:

а) вылучыць словазлучэнні, якія могуць зрабіцца скорагаворкамі;

б) знайсці сярод іх гукаперайманне (гукаперайманні):

“Балоты баламуцяць бегемоты”; “Барадаты баравік у бары блукае” [1, с. 319]; “Ветлівы ветрык варушыць валасы” [1, с. 321]; “Гуртам за горадам гулялі ў гарадкі” [1, с. 322];

в) адзначыць уласна (спецыфічна) беларускія гукі у фрагменце з гукапісам (паўторам зычных – алітэрацыяй):

“Зайграў джаз. Зашоргала піла: дж-дж-дж. Загула пчала: дз-дз-дз… Пачалі дзеці пазнаваць знаёмыя гукі. Дзіва!.. Дзесьці ў лузе драў горла дзяркач. Дзюбаты дзяцел дзюбаў дуб. Завіруха жудасна завывала…” [1, с. 323].

- **Сэнсавае аб'яднанне адзінкавых слоў ці сказаў, пададзеных у адвольным, пераблытаным парадку, у цэласны сюжэт**. У выніку могуць узнаўляцца, да прыкладу, наступныя ўрыўкі:

“Над чаротам трывожна чыгікала чайка”; “Машына шпарка бегла па шашы. Шапацелі шыны: шы-шы-шы. Шум шушукаўся за шклом. Штось шэрае – шась на шашу. Шафёр спыніў машыну. На шашы – шустры шарачок” [1, с. 331].

- **Атаясамліванне герояў дыдактычнага апавядання па апісанні іх паводзін**, у прыватнасці, на аснове перакаструяванага казачнага ўрыўка:

“Жылі-дружылі *Д, Ж, З*. Згуртаваліся ў дружны джаз. [?→ *З*] званіла ў званы [?→ *Д*] дудзела на дудзе. [?→ *Ж*] іграла на жалейцы” [1, с. 322].

Пры гэтым, у форме міні-дыскусіі, абмяркоўваецца пытанне для развагі: "Ці гэта адно і тое ж – дудка і жалейка?" Могуць выкарыстоўвацца "гукавыя ілюстрацыі" адпаведных музычных партый уяўнага аркестра.

- **Творчая, артыстычная інсцэніроўка /драматызацыя/ эпізодаў з вучэбнай казкі**. Навучэнцам, на аснове характэрнай лексікі, прапануецца здагадацца, якія менавіта літары спрачаюцца паміж сабой (сцэна разыгрываецца па ролях):

“*Адна* ўсё ўказвала:

– Уладарка азбукі я – уважлівая, увішная, удачлівая, удумлівая, узнёслая, умелая…

*Другая* фанабэрыста фыркала:

– Фу, уладарка, а я – фігурыстка, футбалістка, фатограф…
– Уф, – уздыхнула *першая,* – мо *ты* і фокусніца?..
– Фокусніца!
– Фантазёрка ты, а не фокусніца, – усміхнулася *першая*” [1, с. 329].

- **Пошук і развіццё традыцыйных казачных сюжэтаў**, па-мастацку пераўтвораных у аўтарскіх дыдактычных казках. Прыклады – творча трансфармаваныя У. С. Ліпскім вядомыя народныя казкі "Рэпка", "Церамок".

Усталяванне міжказачных паралеляў можа закранаць таксама не толькі фальклорныя, але і аўтарскія прыпадабненні, напрыклад: "Ці памятаеце вы, якую літаратурную казку /падказка: а менавіта, гісторыю пра падарожжа з дзікімі гусямі/ нагадвае вандраванне лебядзяў з ліліпутамі?" (паводле казкі "Лічылка").

- **Адшукванне ў казачным тэксте ці самастойнае даканструяванне маралі, высновы**. Да прыкладу, навучэнцы вылучаюць такое павучальнае заканчэнне ў тэксце казкі “Рэпка”:

“Радаваліся: дружным гуртам добра рэпку рваць, прыемна разам вячэраць” [1, с. 327].

Падобнае заданне – фармуляванне абагульненай высновы – прапануецца выканаць ужо самастойна на матэрыяле казкі "Церамок".

- **Вызначенне варыянтаў лінгвістычных тэм, у дачыненні да якіх у заданнях можа быць ужыта вучэбная казка ці яе фрагмент**. У прыватнасці, папярэдне названая казка "Нулёк" можа згадвацца ў сувязі з вывучэннем адмаўлення і асаблівасцяў правапісу *не- (ня-)*, а таксама клічных сказаў. Адпаведна з гэтым могуць вырашацца, як спадарожныя, арфаграфічныя і пунктуацыйныя задачы – правільнае афармленне ўрыўка на пісьме.
- **Спадарожныя лінгвістычныя заданні, у тым ліку пастаноўка задач і пытанняў праблемнага характару**. Прыклад – расставіць належныя націскі ў сказе з казкі, растлумачыць, што адметнага ў пары слоў *муко́* і *му'ка*:

“Мама Малпа малола муку. Мальпяняты Мікі і Мукі памагалі. Мікі – мукамол. Мукі – мукасей. Мала-памалу змалолі мяшок мукі. У Мікі – мазалі, мармыча:

– Мука малоць муку /*М'ука малоць мук'у*/” [1, с. 324].

Заданне дазваляе абвастрыць моўную пільнасць у дачыненні да графічных амонімаў (амографаў).

Паводле казкі "Лічылка" пры вывучэнні імёнаў уласных школьнікі могуць паспрабаваць здагадацца, ці даецца ў казцы адказ на пастаўленае пытанне: "А дзе быў Лявонка?", ці змагла літара *Л* нарэшце яго адшукаць. Для гэтага неабходна будзе атаясаміць паміж сабой скарачэнні імёнаў Лявонка і Лёня.

- **Параўнанне і ацэнка розных магчымых рэдакцый казкі, варыянтаў развіцця казачнага сюжэту**. Да прыкладу, школьнікі супастаўляюць розныя рэдакцыі (варыянты) гучання канцоўкі ў казцы “Сон”, выбіраюць варыянт, які асабіста ім больш падабаецца, тлумачаць сваё меркаванне:

  “Сонца свяціла ў спальню. Прачнуўся Сымон. Паснедаў. Сеў за стол. Старанна пісаў у сшытак словы з літарай *С*.

  Сымон сказаў сястры Соні:

  – Соня, дзівіся: *С* – як месячык!..

  Сястра ўсміхнулася:

  – <u>Вось месячык і пасылае Сымону страшныя сны</u>” [1, с. 328] –

  альбо: “Сястра ўсміхнулася:

  – <u>Вось хто пасылае соням салодкія сны</u>” [2, с. 47].
- **Даканструяванне казачнага сюжэту па прыведзеным эпізодзе**. Так, на вышэй працытаваным матэрыяле з казкі “Нулёк” [1, с. 325–326] можа выконвацца творчае, прадуктыўнае маўленчае заданне – пераказ уласнага варыянта развіцця сюжэту па прачытанай кульмінацыі.
- **Ілюстраванне** (вуснае слоўнае альбо рэчаіснае, прадметна-выяўленчае) **герояў і эпізодаў з казкі**. Напрыклад: “намаляваць словамі” чароўную, “рэкордную”, велічную і велічэзную казачную рэпку з літары *Р*, знайсці ў самастойна створаным апісанні прыметнікі, вызначыць іх ролю ў тэксце – паводле казкі "Рэпка" [1, с. 327].
- **Выкананне альбо канструяванне самімі вучнямі дадатковых заданняў на аснове намаляваных ілюстрацый**, мастацкіх альбо ўласнаручных. Прыклады:

  а) за абмежаваны час або як мага хутчэй знайсці на малюнку 5–7 (ці – як мага больш) прадметаў, назвы якіх пачынаюцца з адпаведнай літары. Практыкаванне асабліва цікава праводзіць ў спаборчай форме;

  б) адшукаць недакладнасць (недакладнасці) на малюнку, прапанаваць выпраўленні, дамаляваць патрэбнае. Такія недарэчнасці, з катэгорыі “На памылках вучацца”, могуць быць, у прыватнасці, звязаны з не толькі з недастатковай увагай да тэксту, але і з недакладнай семантызацыяй, неразуменнем ці напаўразуменнем беларускамоўных лексічных адзінак. Вучні пры гэтым могуць уяўна гуляць у рэдактараў кнігі, мастацкі савет і пад.

Больш пільна працуючы з фрагментамі займальных дыдактыка арыентаваных тэкстаў У. С. Ліпскага, школьнікі могуць належна, па сваёй вартасці ацаніць дасціпную, часам іскрамётную, сюжэтна-матыўную вынаходлівасць выкладу, чуйнасць да слова, мастацкі густ, гумарыстычную афарбоўку аповеду, а таксама – пераканаўчае веданне дзіцячай псіхалогіі, дабрыню і пранікнёную душэўнасць у творах аўтара.

## *Літаратура*


1. *Ліпскі, У.* Каралева белых прынцэс: Выбранае: Аповесці. Казкі. Апавяданні / У. Ліпскі. – Мінск: Юнацтва, 2000. – 335 с.
2. *Ліпскі, У.* Сакрэты колераў вясёлкі: апавяданні, казкі, вершы / У. Ліпскі. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2014. – 119 с.